**Дрыга І.У.,**
*аспірантка кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

# ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ СТРУКТУРЫ СІСТЭМЫ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ ПА МАСТАЦТВЕ Ў НОВЫХ УМОВАХ САЦЫЯЛЬНАГА І ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змены ва ўмовах палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця Рэспублікі Беларусь у канцы 1980—пачатку 1990-х гг. зрабілі свой уплыў на арганізацыю бібліяграфічнай дзейнасці па мастацтве ў краіне. Гэта выклікае неабходнасць вывучэння пытанняў яе ўдасканалення ў новых умовах.

Арганізацыйная структура сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве ў Беларусі ўключае агульнанацыянальны, рэгіянальны і нізавы ўзроўні. Асаблівасці дзейнасці па задавальненні інфармацыйных патрэб розных катэгорый карыстальнікаў патрабуюць разгляду арганізацыйнай структуры падсістэм навукова-, прафесійна-дапаможнай і рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі.

У падсістэме навукова- і прафесійна-дапаможнай бібліяграфічнай інфармацыі прадстаўлены ўстановы і іх падраздзяленні ўсіх трох узроўняў. Асаблівасцю гэтай падсістэмы з'яўляецца цесная ўзаемасувязь бібліяграфічных і інфармацыйных службаў, якая праяўляецца ў дзейнасці сістэмы навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве на базе універсальных навуковых, спецыяльных галіновых, публічных бібліятэк. Службы навуковай інфармацыі ў асноўным забяспечваюць бягучае бібліяграфаванне дакументальных патокаў па мастацтве і бібліяграфічнае інфармаванне спецыялістаў галіны. Аддзелы мастацтва

навуковых універсальных бібліятэк і бібліяграфічныя падраздзяленні спецыяльных галіновых бібліятэк канцэнтруюць свае намаганні на даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні карыстальнікаў-прафесіяналаў і стварэнні рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі.

Сістэму навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве ў краіне ўзначальвае Нацыянальная бібліятэка Беларусі, у якой функцыяніруе аддзел навуковай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва. Ён ажыццяўляе падрыхтоўку і выданне крыніц бягучай бібліяграфічнай інфармацыі для карыстальнікаў-прафесіяналаў мастацтва (“Новая літаратура па культуры і мастацтве Беларусі”, “Сістэматычны паказальнік неапублікаваных дакументаў па культуры і мастацтве”, “Сігнальная інфармацыя”, “Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва”), вядзе іх абслугоўванне ў рэжымах “дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўніцтва”, “выбарчае распаўсюджванне інфармацыі”, “запытанне — адказ”. Шэраг бібліяграфічных паслуг аддзел аказвае на камерцыйнай аснове. Захаванне і пашырэнне бібліяграфічных напрамкаў работы аддзела ў сучасных умовах сталі магчымымі дзякуючы пераходу ў 1992 г. на новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

Рэгіянальны ўзровень сістэмы навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве ўключае абласныя бібліятэкі, цэнтральныя бібліятэкі ЦБС гарадоў і раёнаў Беларусі. На жаль, эканамічныя цяжкасці прывялі да скарачэння колькасці супрацоўнікаў і нават да ліквідацыі адпаведных сектараў у некаторых абласных бібліятэках, што істотна ўскладніла ажыццяўленне інфармацыйнай і бібліяграфічнай дзейнасці ў галіне.

На сучасным этапе напрамкі дзейнасці службаў навуковай інфармацыі рэгіянальнага ўзроўню вызначаюцца ў адпаведнасці з патрэбамі спецыялістаў абслугоўваемай тэрыторыі, фінансавымі і кадравымі магчымасцямі бібліятэк. У абласных бібліятэках яны ў асноўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязаны з групавым і індывідуальным бібліяграфічным інфармаваннем карыстальнікаў-прафесіяналаў, аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкай публікацый з абласных, раённых, гарадскіх газет, падрыхтоўкай паказальнікаў неапублікаваных дакументаў, паступіўшых у даведачна-інфармацыйны фонд сектара, бібліяграфічных спісаў ці аглядаў "Інфармацыя аб негатыўных фактах і падзеях у культурным жыцці вобласці".

У найбольш складаных умовах развіваецца бібліяграфічная дзейнасць інфармацыйных службаў нізавога ўзроўню. Напрыклад, у вядучых вышэйшых навучальных установах мастацтва гэтыя службы займаюцца ў асноўным абслугоўваннем выкладчыкаў і супрацоўнікаў у рэжыме "запытанне — адказ".

Бібліяграфічная дзейнасць аддзелаў мастацтва навуковых універсальных і бібліяграфічных падраздзяленняў спецыяльных галіновых бібліятэк устаноў мастацтва на сучасным этапе галоўным чынам накіравана на бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў-прафесіяналаў і рэтраспектыўнае бібліяграфаванне галіновых дакументаў.

На агульнанацыянальным узроўні цэнтрам бібліяграфічнай дзейнасці па мастацтве з'яўляецца Нацыянальная бібліятэка Беларусі, у якой існуе аддзел мастацтва. На сучасным этапе ён у асноўным займаецца вядзеннем даведачна-бібліяграфічнага апарату і даведачна-бібліяграфічным абслугоўваннем чытачоў. Задача стварэння крыніц рэтраспектыўнай навукова- і прафесійна дапаможнай бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтву пастаўлена перад навукова-бібліяграфічным аддзелам. Але на сённяшні дзень гэты аддзел не вядзе работу па падрыхтоўцы рэтраспектыўных дапаможнікаў па мастацтве для карыстальнікаў-прафесіяналаў і не плануе займацца ёй у бліжэйшы час.

Аддзелы мастацтва абласных бібліятэк, бібліяграфічныя падраздзяленні бібліятэк устаноў і арганізацый мастацтва ў сучасных умовах таксама ў асноўным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажыццяўляюць вядзенне даведачна-бібліяграфічнага апарату і бібліяграфічнае абслугоўванне чытачоў.

Карыстальнікаў-прафесіяналаў у галіне музычнага мастацтва абслугоўвае Нотна-музычная бібліятэка—спецфіліял ЦБС г.Мінска. Яна вядзе галіновы даведачна-бібліяграфічны апарат, займаецца даведачна-бібліяграфічным абслугоўваннем і бібліяграфічным інфармаваннем музычных дзеячаў аб нотных, аўдыёвізуальных дакументах, музыказнаўчай літаратуры.

Рэферыраванне мастацтвазнаўчай літаратуры ажыццяўляе аддзел навуковай інфармацыі па гуманітарных навуках і мастацтве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў зборніку "Беларусістыка".

У структуры падсістэмы рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі агульнанацыянальным цэнтрам з'яўляецца Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Сектар рэкамендацыйнай бібліяграфіі навукова-бібліяграфічнага аддзела вядзе падрыхтоўку і выданне бягучага паказальніка "Беларуская мова, літаратура, мастацтва" і рэтраспектыўных спісаў — дадаткаў да бібліяграфічнага бюлетэня "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку", прысвечаных праблемам мастацтва.

Цэласнасць арганізацыйнай структуры сістэмы забяспечвае наяўнасць унутраных сувязей паміж яе кампанентамі.

Найбольшае развіццё атрымалі сувязі паміж службамі навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве. Аналітыка-сінтэтычную апрацоўку галіновага дакументальнага патоку і выданне бібліяграфічных дапаможнікаў вядзе аддзел навуковай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва, а службы ніжэйстаячых узроўняў выкарыстоўваюць іх у абслугоўванні абанентаў. У той жа час у мэтах найбольш рацыянальнай арганізацыі працы апрацоўка пэўных частак дакументальнага патоку ўскладзена на абласныя службы інфармацыі, якія перадаюць яе вынікі ў аддзел. Органы навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве вышэй-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаячых узроўняў аказваюць ніжэйстаячым службам кансультацыйна-метадычную дапамогу ў розных формах.

Развіваецца аднаўленне ўзаемадзеяння з інфармацыйнымі службамі па культуры і мастацтве былых саюзных рэспублік. Яно пачалося шляхам заключэння двухбаковага пагаднення Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў 1992 г. Потым быў удзел у рабоце камісіі “Бібліятэкі — цэнтры ўсеагульнага доступу да інфармацыі па культуры і мастацтве” Бібліятэчнай асамблеі Еўразіі.

Унутрысістэмныя сувязі паміж іншымі кампанентамі арганізацыйнай структуры развіты слабей. Пытанні бібліяграфічнай дзейнасці рэдка закранаюцца ў кансультацыйна-метадычнай рабоце аддзелаў мастацтва Нацыянальнай і абласных бібліятэк. Спробай каардынацыі дзейнасці па стварэнні бібліяграфічных дапаможнікаў выступаюць выдаваемыя Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі зводныя планы, але яны толькі абагульняюць звесткі без правядзення карэкціроўкі і пераразмеркавання тэматыкі паказальнікаў і баз даных у межах Рэспублікі Беларусь.

Знешнія сувязі сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве з іншымі ўстановамі і арганізацыямі ў найбольшай ступені праяўляюцца пры фарміраванні бібліяграфічных рэсурсаў. У іх стварэнні ўдзельнічаюць навуковыя, навучальныя, навукова-метадычныя, творчыя арганізацыі і ўстановы мастацтва, Нацыянальная кніжная палата Беларусі і іншыя.

Павышэнню эфектыўнасці функцыяніравання сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве будзе садзейнічаць паляпшэнне арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў наступных напрамках.

1. Удасканаленне бібліяграфічных напрамкаў работы службаў навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве:

— павелічэнне кола абанентаў за кошт больш шырокага прыцягнення супрацоўнікаў недзяржаўных і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камерцыйных творчых, прадзюсерскіх, выставачных арганізацый, фірм, студый;

— узбагачэнне наменклатуры бібліяграфічных прадуктаў і паслуг з мэтай забеспячэння карыстальнікаў бібліяграфічнай інфармацыяй па ўсіх відах мастацтва. У першую чаргу неабходна ўключэнне ў сферу дзейнасці інфармацыйных службаў архітэктуры, таму што патрэбы спецыялістаў гэтага віду мастацтва ў інфармацыі аб дакументальных патоках па ім застаюцца ў рэспубліцы незадаволенымі;

— паглыбленне супрацоўніцтва са службамі навуковай інфармацыі па культуры і мастацтве замежных краін.

2. Паляпшэнне арганізацыі дзейнасці па стварэнні сістэмы крыніц рэтраспектыўных навукова- і прафесійна-дапаможнай бібліяграфічнай інфармацыі на традыцыйных і машыначытальных носьбітах на аснове распрацоўкі праграмы іх складання, пабудаванай на каардынацыі і кааперацыі работы універсальных навуковых, спецыяльных галіновых бібліятэк на чале з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і ўстаноў, арганізацый мастацтва.

3. Інтэнсіфікацыя складання крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве на розных носьбітах у адпаведнасці з дасягненнямі сучаснага бібліяграфазнаўства з мэтай фарміравання такой іх сістэмы, якая б магла забяспечыць свабодную самаарыентацыю шырокіх колаў чытачоў у галіновых дакументальных патоках і масівах. У аснову работы павінна быць пакладзена праграма стварэння гэтых дапаможнікаў з удзелам Нацыянальнай, абласных бібліятэк, устаноў культуры і мастацтва, іншых арганізацый.

4. Паспяховае фарміраванне бібліяграфічных рэсурсаў галіны і якаснае ўдасканаленне абслугоўвання розных катэгорый карыстальнікаў пры больш шырокім укараненні новых інфармацыйных тэхналогій у дзейнасць усіх кампанентаў структуры сістэмы.

5. Далейшае развіццё сувязей паміж асобнымі катэгорыямі структуры сістэмы. Садзейнічаць гэтаму павінны пашырэнне кансультацыйна-метадычнай дапамогі Нацыянальнай і абласных бібліятэк па праблемах бібліяграфічнай дзейнасці ў галіне мастацтва, распрацоўка праграм стварэння крыніц бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве ў Рэспубліцы Беларусь, удасканаленне методыкі складання зводных планаў, іх падрыхтоўкі.

6. Перспектыўнымі накірункамі фарміравання знешніх сувязей сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве выступаюць каардынацыя планавання падрыхтоўкі крыніц бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве на розных носьбітах у бібліятэках і ўстановах мастацтва, іх сумесная дзейнасць па стварэнні бібліяграфічных дапаможнікаў і баз даных, развіццё супрацоўніцтва бібліятэк з камерцыйнымі выдавецкімі арганізацыямі, фірмамі ў справе фарміравання бібліяграфічных рэсурсаў галіны.

**Салех Кайс,**
*аспирант кафедры библиотековедения*

## СИСТЕМНЫЙ АНАЛИЗ БИБЛИОТЕЧНОГО ОБСЛУЖИВАНИЯ В УНИВЕРСИТЕТСКИХ БИБЛИОТЕКАХ

Совершенствование учебного процесса в университете сопровождается непрерывным изменением и расширением информационных потребностей профессорско-преподавательского состава. Специфика этих потребностей на каждом этапе определяется характером читаемых и разрабатываемых курсов.

В университетах именно профессора, доценты и преподаватели представляют ведущий массив поль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ